# ЗМЕСТ

## КАЗКІ ПРА ЖЫВЁЛ

**Курачка-рабка.** *Апрацаваў Алесь Якімовіч* ........................8
**Як курачка пеўніка ратавала.**
*Апрацаваў Алесь Якімовіч* ..........................................9
**Як кот звяроў напалохаў.** *Апрацаваў Алесь Якімовіч* .. 11
**Музыкі.** *Апрацаваў Якуб Колас* ................................. 15
**Зайкіна хатка.** *Апрацаваў Якуб Колас* ....................... 19
**Былінка і верабей.** *Апрацаваў Алесь Якімовіч* ............ 22
**Жораў і чапля.** *Апрацаваў Алесь Якімовіч* .................. 25
*Якуб Колас*. **Зайчыкі** ................................................ 27
*Максім Танк*. **Быліна пра мураша Бадзіню** .................. 28
*Станіслаў Шушкевіч*. **Ліса з магнітафонам** ................ 36
*Клаўдзія Каліна*. **Стракатая сойка** ............................ 40

## ЧАРАДЗЕЙНЫЯ КАЗКІ

**Каток — залаты лабок.** *Апрацаваў Алесь Якімовіч* ..... 46
**Піліпка-сынок.** *Апрацаваў Алесь Якімовіч* .................. 48
**Гарошак.** *Апрацаваў Якуб Колас* ................................ 53
**Кот Максім.** *Апрацаваў Алесь Якімовіч* ...................... 60
**Прагны багацей.** *Апрацаваў Алесь Якімовіч*.................. 71
**Сынок з кулачок.** *Апрацаваў Алесь Якімовіч* ............... 74
**Залатая яблынька.** *Апрацаваў Алесь Якімовіч* .............. 78
**Удовін сын.** *Апрацаваў Алесь Якімовіч*......................... 85
**Хведар Набілкін і сапраўдныя асілкі.**
*Апрацаваў Алесь Якімовіч* ........................................ 110
**Ох і залатая табакерка.**
*Апрацаваў Алесь Якімовіч* ........................................ 117
**З рога ўсяго многа.** *Апрацаваў Алесь Якімовіч* ........... 128
**Жалезныя чаравікі.**
*Пераказала Крыстына Лялько* .................................. 138
**Сіняя Світа.** *Пераказаў Уладзімір Сіўчыкаў* ............... 144
*Янка Купала*. **Ваўкалак** ............................................ 148

## САЦЫЯЛЬНА-БЫТАВЫЯ І АВАНТУРНА-НАВЕЛІСТЫЧНЫЯ КАЗКІ

**Не вытрываў.** *Апрацаваў Якуб Колас* ........ 152
**Разумная дачка.** *Апрацаваў Алесь Якімовіч* ........ 156
**Шаптуха.** *Апрацаваў Алесь Якімовіч* ........ 165
**Як Сцёпка з панам гаварыў.**
*Апрацаваў Алесь Якімовіч* ........ 167
**Недалікатны сын.** *Апрацаваў Алесь Якімовіч* ........ 175
**Стралец і рыбак.** *Апрацаваў Алесь Якімовіч* ........ 177
**Надакучлівыя госці.** *Апрацаваў Алесь Якімовіч* ........ 181
**Два камені.** *Апрацаваў Алесь Якімовіч* ........ 183
**Не сіла, а смеласць.** *Апрацаваў Алесь Якімовіч* ........ 184
**Не кажы "гоп", пакуль не пераскочыш.**
*Апрацаваў Алесь Якімовіч* ........ 189
**Панская ласка.** *Апрацаваў Алесь Якімовіч* ........ 191
**Рыжы і лысы.** *Апрацаваў Алесь Якімовіч* ........ 193
**Кулак і парабак.** *Апрацаваў Алесь Якімовіч* ........ 195
**Як мужык царскага генерала правучыў.**
*Апрацаваў Алесь Якімовіч* ........ 197
**Ад крадзенага не пасыцееш.**
*Апрацаваў Алесь Якімовіч* ........ 200
**Пану навука.** *Апрацаваў Алесь Якімовіч* ........ 203
**Людзей слухай, а свой розум май.**
*Апрацаваў Алесь Якімовіч* ........ 208
**Стары бацька.** *Апрацаваў Алесь Якімовіч* ........ 210
**Несцерка.** *Пераказаў Уладзімір Сіўчыкаў* ........ 213
***Пятро Васючэнка*. Нішчымніца.** *З кнігі "Прыгоды паноў Кубліцкага ды Заблоцкага"* ........ 217
***Уладзімір Сіўчыкаў*. Лёс і Удача.** *Інтэрмедыя* ........ 219

## ЛЕГЕНДЫ

**Адкуль свет пайшоў.**
*Пераказаў Уладзімір Сіўчыкаў* ........ 230
**Адкуль пайшлі беларусы.**
*Пераказаў Уладзімір Сіўчыкаў* ........ 230

**Чаму немаўляты не ходзяць.**
*Пераказаў Уладзімір Сіўчыкаў*.......................... 232
**Зямля.** *Пераказаў Уладзімір Сіўчыкаў*.......................... 233
**Страцім-лебедзь.** *Пераказаў Уладзімір Ягоўдзік* ...... 234
**Палешукі і палевікі.** *Апрацаваў Алесь Якімовіч* ....... 236
**Мядзведзь.** *Пераказаў Уладзімір Сіўчыкаў*.............. 240
**Адкуль каза.** *Пераказаў Уладзімір Сіўчыкаў* ........... 241
**Бусел.** *Пераказаў Уладзімір Ягоўдзік*....................... 242
**Буслова помста.** *Пераказаў Уладзімір Сіўчыкаў*....... 244
***Якуб Колас*. Чаму ў сенакос і ў жніво ідзе дождж**..... 244
***Уладзімір Сіўчыкаў*. Чаму кабета**
**спачыну не мае?** *Інсцэніроўка*............................... 245

## ПАДАННІ

**Возера Нарач.** *Пераказаў Уладзімір Сіўчыкаў* ......... 252
**Пра Нёман і Лошу.** *Пераказаў Уладзімір Сіўчыкаў* .. 255
**Менеск.** *Пераказаў Уладзімір Ягоўдзік* ...................... 255
**Бярэсце.** *Пераказаў Уладзімір Ягоўдзік* ..................... 256
**Браслаў.** *Пераказаў Уладзімір Сіўчыкаў* ................... 256
**Адкуль найменне Гомель.**
*Пераказаў Уладзімір Сіўчыкаў*.......................... 258
**Адкуль назва Івянец.**
*Пераказаў Уладзімір Сіўчыкаў*.......................... 258
**Жодзіна.** *Пераказаў Уладзімір Сіўчыкаў*...................... 259
**Машэка.** *Пераказаў Уладзімір Ягоўдзік* ..................... 261
**Лазнік.** *Пераказаў Уладзімір Ягоўдзік* ........................ 262
**Хут.** *Пераказаў Уладзімір Ягоўдзік* ............................ 262
**Святы калодзеж.** *Пераказаў Уладзімір Ягоўдзік* ...... 263
**Бяздоннае багацце.** *Пераказаў Уладзімір Ягоўдзік*... 264
**Чорная дама.** *Пераказаў Уладзімір Ягоўдзік* ........... 266
**Пане Каханку.** *Пераказаў Уладзімір Ягоўдзік* ......... 267
***Ян Баршчэўскі*. Вужыная карона.** *Апавяданне*
*трэцяе з кнігі* “Шляхціц Завальня, або Беларусь
у фантастычных апавяданнях”. *Пераклаў*
*з польскае мовы Мікола Хаўстовіч*........................ 270

***Слоўнічак*.** *Склаў Уладзімір Сіўчыкаў* .................... 281



# КАЗКІ ПРА ЖЫВЁЛ



## КУРАЧКА-РАБКА

Жыў дзед, жыла бабка. Была ў іх курачка-рабка. Нанесла курачка яечак поўны падпечак. Сабрала бабка яечкі ў чарапіцу ды паставіла на паліцу. Мышка бегла, хвосцікам махнула, чарапіца ўпала, яечкі пабіліся.

Плача дзед, плача бабка, курачка кудахча, вароты скрыпяць, трэскі ляцяць, сарокі трашчаць, гусі крычаць, сабакі брэшуць.

Ідзе воўк:

— Дзедка, бабка, чаго вы плачаце?

— Як жа нам не плакаць? Была ў нас курачка-рабка. Нанесла курачка яечак поўны падпечак. Сабрала бабка яечкі ў чарапіцу ды паставіла на паліцу. Мышка бегла, хвосцікам махнула, чарапіца ўпала, яечкі пабіліся.

І воўк завыў.

Ідзе мядзведзь.

— Воўк, чаго выеш?

— Як жа мне не выць? Жыў дзед, жыла бабка. Была ў іх курачка-рабка. Нанесла курачка яечак поўны падпечак. Сабрала бабка яечкі ў чарапіцу ды паставіла на паліцу. Мышка бегла, хвосцікам махнула, чарапіца ўпала, яечкі пабіліся. Плача дзед, плача бабка, курачка кудахча, вароты скрыпяць, трэскі ляцяць, сарокі трашчаць, гусі крычаць, сабакі брэшуць... А я брахаць не ўмею, дык і завыў.

Выслухаў мядзведзь казку і адарваў сабе хвост. Так з таго часу і жыве з куртатым хвастом.

# ЯК КУРАЧКА ПЕЎНІКА РАТАВАЛА

Жылі-былі курачка і пеўнік. Курачка яйкі несла, а пеўнік зярняткі здабываў, курачку частаваў. Выграбе з ямкі зярнятка і кліча курачку:

— Ко-ко-ко, Чубатка, знайшоў зярнятка!

Вось аднойчы выграб пеўнік вялікую бобінку.

“Ну, — думае, — гэтага зярняці курачцы не праглынуць, з’ем хіба сам”.

Праглынуў — ды і падавіўся.

Паваліўся пеўнік, ногі задраў і не дыхае.

Падбегла да яго курачка:

— Што з табою, Пеця? Чаму ты ляжыш і не дыхаеш?

— Ой, — стогне пеўнік, — бобінкай падавіўся...

— Як жа цябе ратаваць, Пеця? — пытаецца курачка.

— Трэба, — шэпча пеўнік, — масла дастаць, горла змазаць.

— А дзе яго дастаць?

— У каровы.

Пабегла курачка да каровы:

— Карова, карова, дай масла!

— Нашто табе масла?

— Пеўнік ляжыць і не дыхае: бобінкай падавіўся.

— Добра, — кажа карова, — дам я табе масла. Але схадзі спярша да касцоў, папрасі сена.

Прыйшла курачка да касцоў:

— Касцы, касцы, дайце сена!

— Нашто табе сена?

— Сена — карове. Карова дасць масла. Масла — пеўніку, бо пеўнік ляжыць і не дыхае: бобінкай падавіўся.

Касцы кажуць:

— Схадзі да пекара, папрасі пірагоў. Пірагі мы з'ядзім, тады і сена накосім.

Прыйшла курачка да пекара:

— Пекар, пекар, дай пірагоў!

— Нашто табе пірагі?

— Пірагі — касцам. Касцы накосяць сена. Сена — карове. Карова дасць масла. Масла — пеўніку, бо пеўнік ляжыць і не дыхае: бобінкай падавіўся.

Пекар кажа:

— Збегай у лес, прынясі дроў, каб было на чым пірагі пячы.

Пабегла курачка ў лес і прынесла дроў.

Пекар напёк пірагоў.

Занесла курачка пірагі касцам. Касцы з'елі пірагі і накасілі сена.

Прынесла курачка сена карове.

Карова з'ела сена і дала масла.

Пеўнік змазаў маслам горла і праглынуў бобінку.

Праглынуў і зноў весела на ўвесь двор заспяваў:

— Ку-ка-рэ-ку! Чуб-чубатка — маладзец!

Тут і казцы канец.